Індрэ ЧЭСНАКАЎСКАЙТЭ

(г.Вільня)

# ЭВАЛЮЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНАГА ФЕСТЫВАЛЬНАГА РУХУ Ў ЛЕТУВЕ: ФЭСТ «SKAMBA-SKAMBA, KANKLIAI» 1968 – 2005 гг.

*Маленькі край мой – як залатая кропля*

*Цёмнага бурштыну.*

*Ён зіхаціць, разводамі квяціцца,*

*І льецца ў песнях званочкамі радасці* [3].

Саламея Нерыс

Летува – краіна тысячы азёраў і ўзгоркаў, прыцемкаў дубовых гаёў і сакавітых лугоў, шырокіх марскіх узбярэжжаў, абведзеных дзюнамі і соснамі. Летувісы спрадвеку слаўныя працавітасцю, пяшчотнымі, дбайнымі адносінамі да прыроды і да шматлікіх помнікаў сваёй даўніны. Існуе крылаты выраз: «Кожны летувіс як нарадзіўся – ўжо спявае». Адной з гарантый захавання нашай нацыянальнай культуры, унітарнасці і незалежнасці Летувіскай Рэспублікі з'яўляецца павага маіх суайчыннікаў да ўласнага фальклору, этнічнай культуры. Пакуль гучаць нашыя песні, народныя інструменты, адпраўляюцца святы, моладзь развучвае танцы і гульні – мы ніколі не забудземся на тое, што мы – асобны еўрапейскі народ, які мае ўсе падставы для годнага, паспяховага суседства з навакольнымі краінамі.

Таму ўстановы, падобныя на Віленскі этнакультурны цэнтр*, дзе мы працуем (Мілда – на пасадзе дырэктара, а я – на пасадзе менеджэра-каардынатара па сувязях з грамадскасцю), ёсць ва ўсіх буйных гарадах і мястэчках Летувы. Увогуле ў Вільні сёння працуюць шэсць цэнтраў культуры рознага кірунку. Спецыфіка нашага цэнтра – скіраванасць выключна на этнічную культуру летувісаў, падтрымка фальклорнага руху, праца з гарадскімі фальклорнымі гуртамі. Фальклорных ансамбляў у Вільні – 50 дарослых і 15 дзіцячых. Мы трымаем з імі сувязь, дапамагаем наладжваць камунікацыю, выдаваць рэкламныя матэрыялы, праводзіць імпрэзы. Дзейнасць такіх ансамбляў, як «Ratilio», «Sadauja», «Ievaras» і інш. самая разнастайная – ад удзелу ў канцэртах і арганізацыі нефармальнага адпачынку моладзі і людзей старэйшага ўзросту да ладжання ўласнымі сіламі летнікаў, фэстаў і выдання фальклорнай літаратуры. Як прыклад можна прывесці дзейнасць фальклорнай суполкі «Nalšia», заснаванай у 1984 годзе. Гэта моцны фальклорны гурт, які ўдзельнічае амаль ва ўсіх фэстах у Летуве, а яго

---

* Vilniaus etnines veiklos centras. Pamenkalnio g. 34, LT – 01114, Vilnius. Tel./faksas. 212 25 93, el.paštas: info@etno.lt.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

фальклорныя калектывы існуюць на грамадскіх пачатках дагэтуль. Іх кіраўнікі не атрымліваюць грошы за сваю дзейнасць, гэта – іх хоббі і прызванне, а не праца.

Цэнтр рэгулярна праводзіць навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, майстар-класы фальклорнай і гісторыка-культурнай тэматыкі. Прыярытэтны накірунак яго дзейнасці – аднаўленне ва ўмовах горада н а р о д н ы х с в я т а ў . Летувіскія: Маслянка – Užgavenes; Вялікдзень – Velikos; Юр'я – Jorė; Купалле – Rasa (Kupalių sventė); Восеньскія Дзяды – Velines (Diedai); Каляды – Kaladų sventė – дагэтуль цікавыя нашым дарослым і дзецям. На сённяшні дзень з'яўляецца самавітай часткай культурнага і грамадскага жыцця краіны і народа. Нават на старых закінутых святочных пляцоўках балтаў – напрыклад, на месцы племяннога цэнтра старажытных прусаў Ромува пад Калінінградам – з 1990-х гг. балтыйскае Купалле ладзіцца штогод[3]. Шэраг святаў мы дапамагаем рабіць Музею народнай архітэктуры і побыту Rumšiškės пад Коўна, шэраг – робім самастойна на вуліцах і ў лесапаркавай зоне Вільні. Стаў святам з моцнымі традыцыямі і далёкавядомы за межамі Летувы віленскі Kazukas – Дзень Св. Казіміра – штогадовае веснавое свята-кірмаш народнай культуры і рамёстваў.

Адным з сімвалаў фальклорнага руху Летувы трывала стаўся фэст «S k a m b a - s k a m b a, k a n k l i a i», які штогадова праводзіцца ў Вільні з 1968 года. Сёння ён вядомы далёка па-за межамі Летувы і збірае аматараў фальклору не толькі нашай радзімы, але і іншых еўрапейскіх, і, нават, азіяцкіх і афрыканскіх краін. Назва яго перакладаецца як «гучыце-гучыце, гуслі» і, як бачыце, прысвечана аднаму з найраспаўсюджаных нацыянальных інструментаў летувісаў – канкле – крылавідным гуслям . Яны бываюць 5-, 9-, 11-струнныя, шырока бытавалі на вёсцы да сярэдзіны XX стагоддзя. Існуе шмат аўдыёзапісаў выканаўцаў на канкле, пад акампанемент якіх летувісы дагэтуль спяваюць, танчаць, займаюцца традыцыйнымі рамёствамі. Адпачатку «Skamba...» не быў фэстам, скіраваным на аўтэнтычныя формы фальклору, – на ім гучала і аўтарская музыка «па матывах» фальклору. Але з 1972 года – фэст «Skamba...» цалкам фальклорнай накіраванасці. У яго межах звычайна маюць месца:

- канцэртныя выступы аўтэнтычных і эксперыментальных фальклорных гуртоў;
- вечарыны – майстар-класы з развучваннем абрадавых песень і побытавых танцаў;
- фальклорныя летнікі для дзяцей;
- канцэрты гасцей у клубах, рэстарацыях і кафэ Вільні;
- конкурс летувіскіх традыцыйных паліфанічных спеваў – сутарцінь'яс;
- агульная танцавальная імпрэза ўдзельнікаў і гасцей фэсту на плошчы перад ратушай – яго ўрачыстае закрыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння фестываль доўжыцца пяць дзён – на наш погляд, гэта аптымальны тэрмін для міжнароднага фальклорнага свята. За яго магчыма: а) наладзіць камунікацыю сярод удзельнікаў, пераэнаёміць іх, даць магчымасць пасябраваць і павучыцца адзін ў аднаго; б) зрабіць markednaбаковы ўнёсак у культурнае жыццё горада і краіны-гаспадара, асабліва без перабольшванняў. Такая працягласць дазваляе нам трывала падтрымліваць інтарэс да фэсту як з боку фальклорных калектываў-удзельнікаў, так і з боку гледачоў, аматараў фальклору. На нашых імпрэзах заўсёды няма адбою ад гледачоў і саўдзельнікаў, а госці, без асаблівых намаганняў з нашага боку, самі шукаюць нас праз інтэрнэт і заяўляюцца да ўдзелу ў фэсце, прычым ніхто не адмаўляецца прыехаць другі раз.

За амаль 40-гадовую гісторыю фэсту ў Вільні перабылі спевакі, музыкі і танцоры больш чым з 50 краін свету. Раней прыярытэтнымі і запатрабаванымі былі м а с а в ы я і відовішчныя формы фестывальнага жыцця: масавыя канцэрты на гарадскім стадыёне, шэсці-дэфіле ўсіх удзельнікаў па цэнтральных вуліцах горада, начныя ўрачыстыя шэсці з запаленымі паходнямі. Зараз назіраецца зварот да больш к а м е р н а г а і эмацыянальнага ў спажыванні народнай культуры, бо першая цікавасць ужо задаволеная і пачалося «знаёмства па інтарэсах». Некаму больш цікава папрысутнічаць на вечарыне народных спеваў a capella ў атрыуме былога Палаца Радзівілаў; некаму – на сумесным праекце фальклорных спевакоў і джазавых музыкаў-інструменталістаў у гарадскім парку; некаму – на камерным канцэрце традыцыйных музыкаў з экзатычнай азіяцкай ці афрыканскай краіны; некаму – набыць прадметы народнага мастацтва летувісаў, выраблены на ўласных вачах народнымі майстрамі ў час прымеркаваных да фэсту кірмашоў.

Штогод мы імкнемся знайсці нешта новае па форме і змесце свята (геаграфічна і культурна – праз запрашэнне новых краін з Блізкага і Далёкага Усходу, Афрыкі і стылістычна розных калектываў ад аўтэнтычных гуртоў да эксперыментальных і авангардных калектываў), але нязменнае правіла: аснова фэсту – сапраўдны фальклор. Менавіта гэта надае «Skamba...» свой непаўторны каларыт, падтрымлівае «высокі градус» імпэту на фестывальных пляцоўках і кулуарах свята. Для забеспячэння пэўнага ўзроўню аўтэнтычнасці фэсту пры адборы яго ўдзельнікаў мы звяртаемся да незалежных экспертаў – фалькларыстаў-прафесіяналаў з Нацыянальнай акадэміі навук, Віленскай кансерваторыі.

Адным з асноўных пытанняў пры арганізацыі і правядзенні фестываляў бывае б ю д ж э т . У 2005 годзе крыніцы фінансавання «Skamba...» выглядалі наступным чынам:

- муніцыпальны бюджэт – каля 10 000 € ;
- сродкі Міністэрства культуры – разы ў 2-3 менш;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

●спонсарскія сродкі прыватных фондаў і фірм, якія мы шукаем самі.

Пошук спонсараў, безумоўна, не самае лёгкае ў нашай дзейнасці, але – рэчаіснасць сённяшняга дня. Як сведчыць досвед працы Цэнтра, аматары народнай культуры ёсць і ў дзяржаўных вытворчых прадпрыемствах, і ў прыватным сектары эканомікі. Тут нам моцна дапамагае дзяржава, залічвае іх спонсарскія ўкладанні ў традыцыйную культуру налогаў і збораў. Гэта, вядома, агульнае правіла для еўрапейскіх краінаў і прынцыповае пытанне ў фінансаванні этнакультурных мерапрыемстваў. Калі спрабаваць сапраўды мэтанакіравана і істотна дапамагаць народнай культуры сваёй краіны, за такі парадак варта паслядоўна змагацца. Сёння, на жаль, фальклор не можа сам сябе фінансаваць і акупаць.

Увогуле, муніцыпалітэт Вільні, фінансуючы дзейнасць Цэнтра, забяспечвае перадусім заработную плату супрацоўнікаў і аплату камунальных паслуг для яго будынка. Каб атрымаць фінансаванне разнастайных мерапрыемстваў, трэба звяртацца асобна і загадзя ў розныя дзяржаўныя і недзяржаўныя ўстановы, абгрунтаваўшы патрэбу ў сродках і мэтазгоднасць іх выдзялення. «Skamba...» не ўключаны ў фестывалі IOV – міжнароднага задзіночання фалькларыстаў. Каб быць уключаным у яго дзейнасць, трэба плаціць рэгулярныя ўнёскі ў яго бюджэт. Мы дагэтуль існавалі без гэтага, і пакуль плануем працягваць уласную дзейнасць без зменаў у гэтым кірунку. Безумоўна, час і далей будзе карэктаваць формы і метады працы, але па адзінаму меркаванню супрацоўнікаў нашага Цэнтра, прынцыпова нязменным правілам для «Skamba-skamba, kankliai» застанецца назаўжды наступнае: аснова фэсту – сапраўдны фальклор. І аматары фальклору – заўсёды пажаданыя і шаноўныя госці Вільні падчас фестывальных імпрэзаў.

## Літаратура


1. Кулаков, В.И. Исторические маршруты по землям пруссов / В.И.Кулаков // Кулаков В.И. Дорогами Ульмеригии : ист. путеводитель. – Калининград : Б-К, 2000. – С. 106 - 265.
2. Тарвидас, С. В семье свободных и равных / С.Тарвидас // Литва. Советский Союз : геогр. описание : в 22 т. – М. : Мысль, 1967. – т. 1 – 22.
3. Rimantas, K. Daina – is praeities j dabartj / K.Rimantas // Kukuoja gegiute. – Vilnus : Diemedzio, 1999. – P. 192 - 221.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ